Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
17 СТУДЗЕНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 10 (29124)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА



ЦІ КАРЫСНЫЯ ЗІМОВЫЯ ПАМІДОРЫ І АГУРКІ?

4

ВЁСКА-СЕЛЬСАВЕТ І ЯЕ ЖЫХАРЫ



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел КАЛАУР, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Меры па павышэнні сукупнай эфектыўнасці эканомікі павінны суправаджацца падтрыманнем здаровага і зразумелага макраэканамічнага асяроддзя, у аснове якога — манетарная і фінансавая стабільнасць. Гэта падмурак доўгатэрміновага эканамічнага росту».*

## КОРАТКА

- Стартавала галасаванне балельшчыкаў за найлепшую ідэю талісмана хакейнага ЧС-2021.
- **Больш за 10 мільёнаў электронных рэцэптаў выпісана ў Беларусі за 2019 год.**
- У Гомельскай вобласці зацвілі персікі.



- **«Мотаршоу-2020» у Беларусі не адбудзецца.**
- Гарадзішча жалезнага веку на тэрыторыі Нежынскага ГУКа выключаць са спісу гісторыка-культурных каштоўнасцяў.
- **МАРГ заключыў пагадненне з аператарамі сувязі аб стрымліванні цэн на паслугі ў 2020 годзе, якім прадугледжана павышэнне тарыфаў не вышэй за базавы ўзровень інфляцыі, г. зн. 4 %.**
- Toyota укладзе каля $400 мільёнаў у вытворчасць лятучых таксі.

ISSN 1990 - 763X

З першых вуснаў

# «ТРЭБА СКАРЫСТАЦЦА ГЭТЫМ МОМАНТАМ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў прэм'ер-міністру Латвіі адкрыта абмеркаваць усе пытанні, якія існуюць ва ўзаемаадносінах дзвюх краін

**Візіт кіраўніка латвійскага ўрада Крыш'яніса Карыньша ў Мінск распачаўся ўвечары 15 студзеня. Раніцай наступнага дня з ім сустрэўся спачатку прэм'ер-міністр Беларусі, потым — Прэзідэнт краіны.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

# ДРУГОЕ ВЯРТАННЕ МЯЧА



**Старажытны меч, якому ні больш ні менш — пяцьсот гадоў, першы раз вярнуўся да людзей сем гадоў назад. Яго тады знайшлі ў рацэ Віхра пад Мсціславам разам з рыцарскімі даспехамі, якія адносяць да XV — пачатку XVI стагоддзя. Пасля гістарычная зброя загадкава знікла, яе шукалі доўгія шэсць гадоў — і знайшлі. Меч вярнуўся ў сцены Музея гісторыі Магілёва. Гэтым разам, трэба думаць, надоўга.**

Фота БелТА.

Знаходкі

# ВЕСТКІ З МІНУЛАГА

## У Гродне знойдзены арыгіналы некалькіх франтавых малюнкаў Васіля Быкава

**Пра гэта паведаміў у сацыяльных сетках Сяргей Шапран, біёграф пісьменніка. На яго думку, факт існавання такіх малюнкаў сам па сабе неверагодны, бо лічылася, што франтавыя малюнкі згарэлі з рэчмяшком у 1945 годзе. Менавіта так сцвярджаў і сам Васіль Быкаў. Але аказалася, што некалькі замалёвак захоўвалася да гэтага часу ў адным з прыватных архіваў у абласным цэнтры.**

Знойдзены тры арыгінальныя копіі графічных накідаў франтавога перыяду жыцця Васіля Быкава. Гэта «Камбат 2. Старшы лейтэнант Ахрын. 1945 г.», «Камандзір гарматы старшы сяржант Прастакоў» і «У раўчуку Саколе». Магчыма, гэтыя надпісы на адваротным баку малюнкаў зроблены самім аўтарам. Накіды апублікаваны ў 1970 годзе ў часопісе «Дружба народов». Праўда, там іх было чатыры.

І вось цяпер ваенныя копіі трох арыгіналаў знайшліся. На жаль, сярод іх не аказалася чацвёртага малюнка, на якім адлюстравана дзяўчына з санітарнай службы. Месцазнаходжанне гэтага накіда невядома. Магчыма, і ён адшукаецца, як тры іншыя, якія таксама лічыліся страчанымі.

Між тым арыгінальныя копіі, якія былі зроблены Васілём Быкавым падчас яго знаходжання на фронце, да гэтага часу захоўваліся ў асабістым архіве гродзенскага журналіста, ветэрана вайны Івана Глухава. Яны з Быкавым былі земляні, абодва франтавікі, пазнаёміліся ў «Гродзенскай праўдзе», дзе бралі ўдзел у рабоце літаратурнага аб'яднання. Ёсць думка, што малюнкі Быкаў выслаў Глухаву па яго просьбе і, магчыма, забыўся аб гэтым.

СТАР. 3